ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 7 (945) | АЎТОРАК, 7 красавіка 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошні чацвер сакавіка адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта. Быў заслуханы і абмеркаваны даклад дэкана С.В.Шалупаева аб развіцці спецыялізацый на кафедрах фізічнага факультэта.

Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў праінфармаваў аб дзейнасці ва універсітэце маладзёжных грамадскіх арганізацый, клубаў і іншых аб'яднанняў.

Савет зацвердзіў спецыялізацыі: гідрагеалогія; геафізічныя метады пошукаў карысных выкапняў па спецыяльнасці "Геалогія і разведка карысных выкапняў".

Студэнткам V курса філалагічнага факультэта Алене Ксяндзовай і Святлане Волкавай з 1 красавіка назначаны імянныя стыпендыі.

На вакантныя пасады ст.выкладчыкаў кафедры фізічнага выхавання і спорту на конкурснай аснове абраны Г.П.Барадзіна і П.П.Саковіч.

На Савеце былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## З УЗНАГАРОДАЙ !

Калектыў універсітэта горача віншуе дэкана факультэта фізічнай культуры ЗАЙЦАВА Барыса Макаравіча, дацэнта кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту ПРАЦКО Юрыя Піліпавіча і старшага выкладчыка гэтай жа кафедры КІРЭЕВА Валерыя Канстанцінавіча з узнагародай іх Ганаровымі граматамі Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў.

## СЯРЭБРАНЫ ЮБІЛЕЙ ІНСТЫТУТА

Споўнілася 25 гадоў з дня заснавання Магілёўскага тэхналагічнага інстытута. Галоўная ўрачыстасць, прысвечаная гэтай знамянальнай падзеі, адбылася 27-га сакавіка. Сярод шматлікіх віншаванняў юбілярам было і ад нашага універсітэта. Выказаў іх і ўручыў прывітальны адрас ад калектыву ГДУ імя Ф.Скарыны рэктар член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

## СУСТРЭЧА З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ГРУПАЙ

З выкладчыкамі, супрацоўнікамі і студэнтамі ГДУ сустрэліся члены інфармацыйнай групы адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь першы прарэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі Л.С.Касцевіч і загадчык кафедры расійскай і славянскай гісторыі Белдзяржуніверсітэта І.В.Аржахоўскі. Удзел у сустрэчы прымаў таксама намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкома В.С.Ахлесцін.

У сваім дакладзе Л.С.Касцевіч расказаў аб новай Канстытуцыі нашай краіны, як гаранце правоў і свабод беларускага народа, структуры і задачах Нацыянальнага сходу рэспублікі, узаемадзеянні яго дзвюх палат, што дае магчымасць забяспечваць нармальны законатворчы працэс, аб сённяшнім стане эканомікі Беларусі.

Выступленне гісторыка І.В.Аржахоўскага прысвячалася нацыянальнаму самавызначэнню беларускага народа, расставіла акцэнты ў патынні, якую дату трэба лічыць пачаткам адліку беларускай дзяржаўнасці.

На сустрэчы выступілі рэктар член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў і прафесар кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін А.С.Калугін.

**Навукова-практычная канферэнцыя**

## КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦЬ

Адной з самых важных падзей сёлетняга года ў жыцці нашага універсітэта стала І Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Экалогія і моладзь" (даследаванні экасістэм ва ўмовах радыеактыўнага і тэхнагеннага забруджвання акаляючага асяроддзя), якая праведзена на базе біялагічнага факультэта. Яе арганізатарамі, як мы ўжо паведамлялі, былі Міністэрства адукацыі, ГДУ, Інстытут лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Беларускі дзяржаўны універсітэт транспарту, Гомельскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы акаляючага асяроддзя.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел 320 навукоўцаў і практычных работнікаў з многіх ВНУ, акадэмічных інстытутаў і навукова-даследчых устаноў Беларусі, а таксама Расіі, Украіны, Літвы, Малдовы, Польшчы. Іх цёпла павітаў у сваей тэлеграме старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу РБ П.У.Шыпук.

У дзень заезду для гасцей была наладжана экскурсія па Гомелю. Яны наведалі краязнаўчы музей, Дом паляўнічага, экалагічны цэнтр Гомельскага абласнога ліцэя. Затым у актавай зале універсітэта з лекцыяй "Аддаленыя вынікі аварыі на Чарнобыльскай АЭС: ацэнка праз 12 гадоў" выступіла доктар біялагічных навук, загадчыца лабараторыі антымутагенезу Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Р.І.Ганчарова.

(Заканчэнне на 2 стар.)





*На здымку:* **перад удзельнікамі канферэнцыі выступае адзін з самых актыўных яе арганізатараў загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды кандыдат біялагічных навук, дацэнт А.У.ГАЎРЫЛАЎ.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## СТЫПЕНДЫІ ПРАФСАЮЗА

За актыўны ўдзел у прафсаюзнай рабоце і высокія паказчыкі ў вучобе на ІІ семестр 1997-98 навучальнага года назначаны прафсаюзныя стыпендыі (даплата да вучэбнай):

**абкома прафсаюзаў** -- Андрэю **КРАЖАВУ**, студэнту ІІ курса гісторыка-юрыдычнага факультэта;

**прафкома студэнтаў ГДУ** -- Алене **САЎЧАНКА**, студэнтцы IV курса геолага-геаграфічнага факультэта і Людміле **САРОКА**, студэнтцы ІІІ курса фізічнага факультэта.

Памер першай з названых стыпендый складае 1,5 мінімальныя зарплаты, другой -- 1 мінімальную зарплату.

**Культура**

## У ГДУ -- ПЯТЫ НАРОДНЫ КАЛЕКТЫЎ

Спектаклем па п'есе Васіля Ткачова "Шкірдзюкі займаюць абарону" універсітэцкі студэнцкі тэатр-студыя "Если бы..." (рэжысёр Г.І.Варонін) трымаў у снежні мінулага года перад аўтарытэтнай камісіяй экзамен на атрыманне звання народнага самадзейнага калектыву.

І вось радасная, прыемная вестка прыйшла нядаўна ў культурны цэнтр ГДУ -- рашэннем Калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь тэатру-студыі прысвоена ганаровае званне.

Віншуем! Цяпер, безумоўна, гэта творчы калектыў да многага абавязвае. Як кажуць, трэба трымаць марку дастойна. А калі ёсць добры рэжысёр, таленавітыя акцёры-студэнты, цікавыя п'есы, якія можна ставіць на сцэне, такая задача будзе тэатру па сілах.

У нядзелю, 5 красавіка, універсітэцкі тэатр паказаў свой спектакль на сцэне абласнога драмтэатра ў рамках заключнага этапу агляду-конкурсу сярод тэатральных самадзейных калектываў І рэспубліканскага фестывалю народнага мастацтва Беларусі. Конкурсная камісія выбірала з 7 тэатральных калектываў Гомельшчыны лепшы, дастойны прадстаўляць нашу вобласць на апошнім туры фестывалю ў сталіцы рэспублікі г.Мінску.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі і супрацоўнікі, студэнты гісторыка-юрыдычнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры правазнаўства Юрыя Андрэевіча КЛЮЧНІКАВА з зацвярджэннем яго БелВАКам у вучонай ступені кандыдата юрыдычных навук.*

## АДГУКНУЛІСЯ НА ЧУЖЫ БОЛЬ

Нялёгка жывецца нам зараз. А шматдзетным сем'ям -- цяжэй удвая. Таму нярэдка цяпер можна прачытаць у газетах пісьмы людзей са шчымліва-кранальнымі просьбамі аб дапамозе -- грашыма, адзеннем, лекамі...

Адно з такіх пісьмаў было надрукавана ў лютым у адным з нумароў прафсаюзнай газеты "Беларускі час". Шматдзетная маці В.М.Ігнацьева з г.Глыбокага Віцебскай вобласці напісала аб цяжкім матэрыяльным становішчы сваёй сям'і і прасіла ў людзей дапамогі, каб апрануць, абуць сваіх шасцёра дзяцей.

Па ініцыятыве прафкома нашага універсітэта былі сабраны неабходныя для гэтых дзяцей адзенне і абутак, якія прынеслі выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ. Прафком дапоўніў іх рэчамі з гуманітарнай дапамогі, атрыманай раней з Германіі, і даслаў у г.Глыбокае пасылку.

Нядаўна ў прафком прыйшло пісьмо ад В.М.Ігнацьевай, у якім ёсць, у прыватнасці, такія радкі: "Не магу перадаць тыя пачуцці ўдзячнасці Вам і вашаму калектыву за вашу падтрымку і цеплыню. Вялікае Вам дзякуй. Я яшчэ раз пераканалася ў тым, што свет не без добрых людзей..."

Навукова-практычная канферэнцыя

# КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На наступны дзень з пленарнага пасяджэння пачалася рабочая праграма канферэнцыі. Уступным словам яе адкрыў рэктар універсітэта член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар Л.А.Шамяткоў. Ён цёпла павітаў удзельнікаў навуковага форуму і пажадаў ім плённай працы.

На пленарным пасяджэнні ключавым стаў даклад "Экалагічныя праблемы Гомельскага рэгёна", з якім выступіў старшыня Гомельскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы акаляючага асяроддзя М.А.Мачуленка. Яго дапоўніла дакладам "Эканамічныя праблемы аховы акаляючага асяроддзя Рэспублікі Беларусь" Л.А.Атамаліева з Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта.

Вялікую цікавасць выклікаў даклад польскага вучонага Л.Ю.Пілка "Ажыццяўленне экалагічнага навучання ў Познаньскім універсітэце імя А.Міцкевіча".

На пленарным пасяджэнні з актуальнымі дакладамі выступілі таксама А.Н.Пераваломі і Л.А.Гаўрылава з Інстытута лесу НАН Беларусі, С.Я.Дубінін з Гомельскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, А.Ф.Мінакоўскі з Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, Л.Г.Сідарава з Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту. Апошняя, у прыватнасці, гаварыла аб экалагічных праблемах наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Затым канферэнцыя працягвала работу ў 8 секцыях: структурныя і функцыянальныя асаблівасці экасістэм; антрапагенная трансфармацыя і праблемы кіравання экасістэмамі; хімічныя праблемы ў экалогіі; уздзеянне радыяцыі і тэхнагеннага забруджвання на жывыя арганізмы; экалогія чалавека і медыцынскія праблемы акаляючага асяроддзя; праблемы экалагічнай адукацыі ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах; эканамічныя і прававыя праблемы аховы акаляючага асяроддзя; ахова прыроды і рацыянальнае прыродакарыстанне.

Усяго на канферэнцыі было заслухана і абмеркавана 117 дакладаў. Пераважная большасць іх належала беларускім аўтарам. Разам з тым трэба адзначыць, што актыўны ўдзел у распрацоўцы экалагічных праблем і падрыхтоўцы дакладаў прынялі навукоўцы Днепрапятроўска, Харкава, Чарнігава.

Па выніках работы канферэнцыі, удзел у якой прыняў старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў кандыдат эканамічных навук В.С.Сяліцкі, прыняты адпаведныя рэкамендацыі. Укараненне іх у практыку дазволіць значна аздаравіць экалагічную сітуацыю як у Гомельскім рэгёне, так і па ўсёй забруджанай тэрыторыі.

Тэзісы дакладаў апублікаваны ў трох кнігах.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

## ДЛЯ ЗАКЛЮЧЭННЯ КАЛЕКТЫЎНАГА ДАГАВОРУ

У сувязі з падрыхтоўкай канферэнцыі па зацвярджэнню калектыўнага дагавору паміж працоўным калектывам універсітэта і наймальнікам (рэктарам універсітэта) загадам па ГДУ ад 24 сакавіка г.г. для падрыхтоўкі тэксту гэтага дагавору ад адміністрацыі створана камісія ў складзе прарэктара па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях А.П.Кармазіна, прарэктара па АГР У.М.Палевікова, начальніка планава-фінансавага аддзела С.Я.Пашук.

25 сакавіка на пасяджэнні прафсаюзнага камітэта зацверджана адпаведная камісія ад прафсаюзнай арганізацыі. У яе ўвайшлі старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі, члены прафсаюзнага камітэта рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт" У.П.Балога і асістэнт кафедры камерцыйнай дзейнасці і фінансаў А.Л.Вайцішкіна.

З рэспубліканскага семінара



# ЯК УМАЦАВАЦЬ ПРАФСАЮЗНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ

На базе Полацкага дзяржуніверсітэта, Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага і Віцебскага тэхналагічнага універсітэтаў адбыўся рэспубліканскі семінар-нарада старшынь прафкомаў навучэнцкай моладзі. У ёй прынялі ўдзел кіраўнікі студэнцкіх прафсаюзных арганізацый звыш 20 ВНУ рэспублікі.

У першы дзень семінара за "Круглым сталом" па пытаннях арганізацыйнага ўмацавання прафсаюзных арганізацый навучэнцкай моладзі было заслухана і абмеркавана 6 дакладаў старшынь прафкомаў студэнтаў: Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, Гродзенскага дзяржуніверсітэта, Магілёўскага тэхналагічнага інстытута і Магілёўскага дзяржпедуніверсітэта, БДЭУ па арганізацыі работы па прыёму ў члены прафсаюза студэнтаў-першакурснікаў, павышэнню грамадскай актыўнасці членаў прафсаюзаў, асаблівасцей узаемадзеяння прафкома студэнтаў з рознымі грамадскімі фарміраваннямі. Старшыня прафкома студэнтаў нашага універсітэта Н.І.Колтышава выступіла з дакладам "Матывацыя прафсаюзнага членства -- важнейшы напрамак работы прафкома студэнтаў".

Актуальныя пытанні арганізацыйнага ўмацавання прафсаюзных арганізацый навучэнцкай моладзі, работы Савета старшынь прафкомаў студэнтаў асвятляліся ў выступленнях загадчыка аддзела БРК прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі А.Л.Ліхтаровіча і старшыні прафкома БДУ Н.М.Радзевіч.

Затым работа семінара працягвалася ў Віцебскім тэхналагічным універсітэце. Яго ўдзельнікі падрабязна азнаёміліся з практыкай работы прафкома студэнтаў гэтай навучальнай установы.

У рабоце семінара прыняў удзел намеснік старшыні Савета федэрацыі прафсаюзаў М.А.Беланоўскі, які выступіў з дакладам.

# БПСМ: ЧТО МЫ МОЖЕМ ДАТЬ МОЛОДЕЖИ

Для нынешнего поколения слова "молодежное движение" практически ничего не говорят. Вернувшись в недалёкое прошлое, мы сразу вспоминаем слово "комсомол". Через призму истории многие склонны оценивать его как нечто одиозное. В конце-концов каждый имеет право на собственное мнение. Но еще несколько лет назад с этой организацией многие связывали свое будущее. Большинство считало необходимостью быть членом комсомола. Именно там кипела молодежная жизнь. Именно оттуда вышли многие отечественные политики, бизнесмены, журналисты современности. Это молодежное движение помогало людям найти свое место в нашей непростой жизни, сформировать обширный круг знакомств, единомышленников.

Времена изменились. Комсомол канул в лету. Его место пыталось занять множество "диванных" (по количеству членов) организаций как правого, так и левого толка. Политизированных и не очень. Что они дали молодежи -- мы видим, точнее не видим ничего. Однако, это история.

Сейчас появилась и динамично развивается молодая, но уже показавшая себя, как одна из наиболее сильных, организация -- Белорусский патриотический союз молодежи. Создана она около года назад. Уже на этапе создания организация обрела ярых критиков. Это неудивительно. Ведь в излишне политизированном обществе любое крупномасштабное начинание представляется как некая политическая акция. Возможно. Но это молодежная политика, которая проводится государством для поддержания молодежи, придания ей весомого социального статуса, защиты интересов и конституционных прав каждого молодого человека. И ничего больше за словами "молодежная политика" не скрывается.

Естественно, что необходимость любого начинания нужно доказывать конкретными делами. Уже сейчас, когда, по сути, организация находится на этапе становления, есть конкретные примеры: молодежный билет БПСМ, показывающий принадлежность человека к нашей организации, -- это не просто "корочка", это удостоверение личности, действительное на всей территории Беларуси. С его помощью вы сможете получить скидки на транспорте, во многих музеях, магазинах, гостиницах, на дискотеках и т.д. Первые ласточки этого: 30-ти процентная скидка на входной билет в дискоклуб "Лайт", 7-ми процентная -- в кафе "Дружба" (ул.Билецкого). В фотостудии "AGFA" по улице Победы предъявителю молодежного билета услуги обойдутся на 10% дешевле. И это только начало.

На обратной стороне билета указан телефон "Линии помощи". Член БПСМ, попавший в затруднительную ситуацию (например, во время поездки по Беларуси произошло ограбление, утеря проездных документов и денег), обратившись по этому телефону, получит незамедлительную помощь.

Многие из вас присутствовали на дискотеках, посвященных празднику города, Международному дню студентов, на площади Ленина. Они также организованы с помощью БПСМ. Таких крупных мероприятий на счету нашей организации уже много.

Проводились также благотворительные вечера для ветеранов ВОВ, детей-инвалидов.

В конце прошлого года под эгидой БПСМ прошла общереспубликанская благотворительная акция в помощь инвалидам. В рамках этой акции восемь студентов нашего университета получили материальную помощь. Наш комитет оказывал помощь в проведении Дней факультетов, новогодней елки. С помощью комитета БПСМ ГГУ была проведена "Неделя компьютерных наук". Для охраны выставочного зала, где находились компьютеры, мы своими силами организовали круглосуточное дежурство. Кстати, для выполнения подобных задач сейчас организуется Служба охраны при комитете БПСМ ГГУ.

Совместными усилиями первичных организаций БПСМ гомельских вузов 15 марта была проведена спартакиада. Победила команда нашего университета, капитаном которой является студент экономфака Андрей Агиевич.

Повторюсь, что это лишь начало деятельности. Следует заметить, что количество и качество реальных проектов напрямую зависит от количества людей, пришедших в организацию. Конкретные дела делают конкретные люди! Поэтому, если у вас есть идеи, если у вас есть способности, которые вы хотите реализовать, -- приходите к нам, и мы вместе постараемся воплотить их в жизнь.

Что касается учебного процесса. С этого учебного года представитель комитета БПСМ ГГУ является членом приемной комиссии, входит в состав Совета университета. Это дает возможность решать проблемы каждого конкретного студента на уровне администрации ВУЗа. То есть у студентов появился еще один гарант соблюдения их прав.

Сейчас решается вопрос об организации летнего отдыха студентов. Возможно, уже к нынешнему лету мы сможем помочь в этом вопросе.

В заключение хочу сказать, что лицо организации формируют люди, которые в ней состоят. Приходите и привносите с собой то лучшее, чем должен обладать Белорусский патриотический союз молодежи.

**К.КЕКИШ**, первый зам.секретаря комитета БПСМ, студент экономического факультета.

Пытайце -- адказваем

## РАМОНТ СТРЫМЛІВАЕ НЕДАСТАТКОВАЕ ФІНАНСАВАННЕ

На нядаўна прайшоўшай справаздачна-выбарнай канферэнцыі пярвічнай арганізацыі БПСМ ГДУ група студэнтаў філалагічнага факультэта задала пытанне адміністрацыі універсітэта. Будучых педагогаў хвалюе аварыйны стан вучэбных карпусоў N1 і N3. Калі так будзе працягвацца, сцвярджаюць яны, можна дачакацца бяды.

За адказам рэдакцыя звярнулася да прарэктара па АГР У.М.Палевікова. Вось што ён адказаў:

-- Названыя вучэбныя карпусы сапраўды патрабуюць неадкладнага рамонту. Гэта мы добра разумеем. Але справа залежыць не столькі ад адміністрацыі, колькі ад бюджэтнага фінансавання. Яно ж далёка ад патрэбнага. Напрыклад, сёлета Міністэрства адукацыі выдзеліла нашаму універсітэту на капітальны рамонт пакуль што ўсяго 9,5 млрд. руб., у тым ліку 7,5 млрд. руб. на рэканструкцыю з расшырэннем вучэбна-спартыўнага корпуса. Значыць, на астатнія аб'екты роўна 2 млрд. руб. І яны ўжо асвоены.

Аб вучэбным корпусе N1. На яго капітальны рамонт "Гомельграмадзянпраектам" выдадзены неабходны праект. Восенню мінулага года поўнасцю адрамантаваны дах гэтага чатырохпавярховага будынка. Цяпер выбарачна вядзецца рамонт аўдыторый, якія аказаліся ў найгоршым стане. Тэмп работы будзе залежаць ад узроўню фінансавання міністэрствам.

У вучэбным корпусе N3 адрамантавана 60 працэнтаў даху. У належны стан прыводзяцца аўдыторыі. Аднак, яшчэ раз падкрэслю, канчатковыя вынікі неадкладных работ залежаць ад іх своечасовага фінансавання.

**На Днях геолага-геаграфічнага факультэта**

Жыццё не здаецца такім будзённым і аднастайным, таму што ў ім ёсць святы. І прафесійныя, у тым ліку.

У першую нядзелю красавіка адзначаюць свой Дзень геолагі -- рамантыкі далёкіх дарог, вечныя шукальнікі і першаадкрывальнікі прыродных багаццяў. Менавіта таму па традыцыі ў пачатку красавіка ў нашым універсітэце праводзяцца Дні геолага-геаграфічнага факультэта.

Вось і сёлета былі яны цікавымі і запамінальнымі, бо выкладчыкі і студэнты падрыхтавалі іх разнастайную праграму. Адбыліся захапляльная экскурсія па мінералагічнаму музею універсітэта, навуковая студэнцкая канферэнцыя, на факультэце і ганаровых гасцей з універсітэта "Уорвік" (Вялікабрытанія).

На святочным "Агенычыку", які праходзіў у студэнцкім кафэ, прадстаўнікі рэктарата, гра-

## І З КАРЫСЦЮ, І ВЕСЕЛА

якой заслухана звыш 40 змястоўных і цікавых пленарных і секцыйных дакладаў.

Да 1 красавіка -- дня смеху кожная акадэмічная група падрыхтавала сваю насценную газету, пераможцам уручылі призы.

Гасцінна сустракалі на мадскіх арганізацый ГДУ павіншавалі выкладчыкаў і студэнтаў з прафесійным святам, лепшым уручылі граматы і грашовыя прэміі.

Памераліся сіламі на спартыўнай пляцоўцы ў футбольным матчы каманды выкладчыкаў і студэнтаў.

**(Наш кар.)**

## ГОЛАСУ ЦУДОЎНАЕ ГУЧАННЕ

Выставачная зала нашага універсітэта стала своеасаблівым духоўным аазісам, дзе можна далучыцца да прыгажосці, што нясе нам мастацтва ў любым сваім праяўленні. Не толькі жывапісныя палотны мастакоў мы можам бачыць штомесячна ў новых экспазіцыях. Тут жа адбываюцца сустрэчы з творчымі людзьмі, тут гучаць і узнёслыя паэтычныя радкі, і прыгожы вакал.

Не ўпершыню выступала ў выставачнай зале заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Галіна Паўлянок. Яе чароўны голас -- мецца-сапрана -- заваражвае, перапаўняе найлепшымі пачуццямі душу кожнага слухача. У яе выкананні прагучалі рамансы, вядомыя творы рускіх і замежных кампазітараў.

Студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, якія прыйшлі на канцэрт Г.Паўлянок, засталіся вельмі ўдзячнымі сапраўднаму майстру вакальнага мастацтва за падораны ёю цудоўныя імгненні.

**Т.НІКАЛАЕВА.**



Конкурс "Містэр універсітэта"

## КАСЦЮМ ДЛЯ ДЖЭНТЛЬМЕНА

З партрэтаў пераможцаў традыцыйнага конкурсу "Містэр універсітэта" ужо можна было б стварыць калі не галерэю, то штосьці на гэта падобнае. Іх ужо на сённяшні дзень ва універсітэце -- восем! І апошнім стаў нядаўна студэнт матэматычнага факультэта Дзмітрый Жыхараў.

... А пачыналася ўсё, як звычайна, для падобных мерапрыемстваў. Білетаў для усіх жадаючых трапіць на цікавае дзейства ў актавую залу катастрафічна не хапала, бо даўно стварыўся "імідж" гэтага конкурсу, як аднаго з найбольш цікавых ва універсітэце. Ёсць у конкурса ўжо і свае пастаянныя спонсары -- кампанія "Сцімарал", камерцыйная фірма "Фінінтэкс" і прафком студэнтаў.

Кожны з васьмі факультэтаў прадставіў свайго прэтэндэнта на атрыманне звання сапраўднага джэнтльмена. Дзяніс Міхасёў абараняў гонар геолага-геаграфічнага факультэта, Аляксандр Казіміраў -- фізічнага, Аляксандр Прыходзька -- біяфака, Руслан Зарыпаў -- эканамічнага, Дзмітрый Жыхараў -- матфака, Дзітрый Струцінскі -- гісторыка-юрыдычнага, Дзмітрый Васькаўцоў -- факультэта фізічнай культуры, Павел Бабчанок -- філфака. Усіх іх чакалі выпрабаванні пяці састаўляючых конкурсаў. Былі яны і фатаграфамі-мастакамі, стараючыся зрабіць здымак сваёй фотамадэлі ў найлепшым ракурсе, і "пісьменнікамі-астролагамі", прадракаючымі будучае нашай планеты. Свае кулінарныя здольнасці ім трэба было паказаць у гаспадарчым конкурсе -- правільна прыгатаваць некаторыя фірменныя стравы з меню "Макдональдса". Фантазія некаторых з іх пераўзышла ўсе межы так, што члены журы катэгарычна адмовіліся пакаштаваць гэтыя "творы кулінарнага мастацтва".

Самым цікавым, відовішчным стаў тэатральны конкурс, бо ён рыхтаваўся як дамашняе заданне. На некаторы час юнакі сталі вядомымі жаночымі кінаперсанажамі -- Элачкай-людаедачкай з "Дванаццаці стульяў", Манькай-аблігацыяй з тэлесерыяла "Месца сустрэчы змяніць нельга", паварыхай Тосяй Кісліцынай з камедыі "Дзяўчаты" і інш. Гледачы смяяліся над убачаным да слёз на вачах.

Музычнае выпрабаванне -- на голас, слых, рытм прынесла канкурсантам залішняе хваляванне з-за некаторых тэхнічных збояў з фанаграмамі песень. Давялося ім паўтараць "свой сольны дэбют".

З пераменным поспехам ішла конкурсная барацьба: Р.Зарыпаў быў прызнаны журы лепшым "Настрадамусам" і атрымаў прыз -- кнігі; Д.Васькаўцоў -- "мэтрам" фотаздымкаў, за



**На фотаконкурсе гэты здымак названы журы лепшым. Яго аўтар -- Дзмітрый Васькаўцоў.**



**"Містэр універсітэта - 98" Дзмітрый Жыхараў.**

што яму быў уручаны фотаапарат; Д.Струцінскі пакарыў залу і журы выкананнем песні "Девочка моя", атрымаўшы аўдыекасеты; Д.Жыхараў быў лепшым двойчы -- у гаспадарчым і тэатральным конкурсах. Па суме набраных балаў ён і стаў пераможцам -- "Містэрам універсітэта-98". Элегантны касцюм, які яму быў падораны, будзе надаваць Дзмітрыю імідж сапраўднага джэнтльмена.

Віцэ-містэрам конкурсу стаў Р.Зарыпаў, прыз сімпатый гледачоў заваяваў А.Казіміраў, спецыяльны прыз кампаніі "Сцімарал" -- А.Прыходзька.

**Т.ДУБЯК.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**



**Будующие абитуриенты, а ныне слушатели подготовительного отделения специальности "Русский язык и литература" досконально изучают на занятиях произведения русских и советских классиков. Преподаватель Т.Авдонина ищет по-своему оригинальные, интересные способы проверки знаний своих подопечных. Это дает возможность найти среди них способных, талантливых ребят. В этом можно убедиться, прочитав публикуемый ниже рассказ слушательницы подготовительного отделения Натальи Полегиной, составленный ею по 56 названиям произведений А.П.Чехова.**

## НЕВЕРОЯТНЫЕ ПРИКЛЮЧЕНИЯ ЧЕХОВСКИХ ГЕРОЕВ

Этот **случай из практики архиерея Ионыча**, который бросил врачебную деятельность в **наш практический век**. А рассказал он его в **письме к ученому соседу-печенегу**, который давно уговаривал Ионыча бросить свою **хирургию** вместе с **палатой N6**.

"Здравствуй, брат-печенег, -- писал Ионыч. -- С тех пор, как был я **в ссылке** из-за **смерти чиновника** и **депутата** (помнишь, **как у Дездемонова 25 рублей пропало**), моя жизнь стала будто **канитель**. Я, как **злоумышленник** какой-то, должен был встать на путь истинный. **Три года** не мог я решиться, жил **у родственников в доме с мезонином**, жевал крыжовник, ел **устрицы**, ходил ловить **налима**. Но как только стал я архиереем, **торжество победителя** охватило меня. Сколько судеб я соединил.

**Унтер Пришибеев** взялтаки в жены **дочь Альбиона**. (Он же вечно дарил ей **цветы запоздалые**). А однажды крестьянин **Ванька**, узнав, что **кухарка женится**, почувствовал, как **тоска и горе** снедают его **душечку**, да и написал в **жалобную книгу**.

Было и еще. Помню, **три сестры** пошли на **юбилей** к **дяде Ване**. Решив прогуляться в **вишневом саду**, натолкнулись там на **медведя**. Дядя Ваня по крику **чайки** догадался об опасности, спас сестер и даже сделал одной **предложение**. Ох, и **свадьба** была.

Ну да это еще что. Намедни **мужики** привезли **на подводе человека в футляре**, найденного **в овраге**. Пришлось отслужить **панихиду**.

А **на святках**-то, **дама с собачкой** прогуливалась **в родном углу**, как вдруг из-за этого самого угла вывернул **учитель словесности** со своей **невестой**, держа на поводке **Белолобого**. Вдруг собаки, завидев в кустах **хамелеона**, кинулись за ним. Испугавшись собак, прогуливавшаяся здесь же г-жа Анна, бросилась к учителю словесности, а собаки сбили толстого, который повалился на тонкого. Невеста, увидев **Анну на шее** своего жениха, заявила, что ей никогда не нравилась его **лошадиная фамилия**, и вообще, пусть он остается теперь со своей **попрыгуньей**. **Толстый и тонкий** отряхивались и ругались, а учитель словесности, представь себе, так и живет теперь с Анной на шее **в усадьбе**.

Сколько всего еще в моей практике было. Всего не передать. А теперь мне что-то **спать хочется**. На том с тобою и прощаюсь, брат-печенег".

Вот такое письмо **о любви**.

**Н.ПОЛЕГИНА.**

## БУДЗЕМ СМЯЯЦЦА...

Здавалася б, не да смеху нам зараз, калі матэрыяльныя праблемы нагадваюць аб сабе літаральна на кожным кроку. Тым не менш, менавіта пачуццё гумару дапамагае людзям не патануць у віры жыццёвых праблем. І дзякуй Богу, што ёсць цудоўнае свята: 1 красавіка — дзень смеху, калі людзі жартуюць адзін над адным, прыдумваюць разнастайныя розыгрышы. А гэта дае магчымасць адпачыць душой, расслабіцца.

Выдатны зарад весялосці і бадзёрасці атрымалі студэнты і супрацоўнікі ГДУ на вечары гумару, які прайшоў у актавай зале універсітэта. Іх запрасілі сюды студэнцкія тэатры — эстрадных мініяцюр, "Если бы..." і "Люстэрка".

◆◆◆

Вясёлы вечар, прысвечаны дню гумару, адбыўся ў інтэрнаце N1. У яго праграме было цікавае спляценне навейшых анекдотаў, народных баек, гумарэсак і займальных конкурсаў.

Артысты народнага студэнцкага тэатра-студыі "Если бы..." на чале са сваім знаходлівым рэжысёрам Г.Вароніным смяшылі прысутных украінскімі байкамі, студэнцкімі анекдотамі. Не давалі сумаваць юнакам і дзяўчатам студэнты матфака А.Грачова, А.Налецька, Д.Жыхараў (ён жа "Містэр універсітэта-98"), за што былі адораны шчырым смехам, гарачымі апладысментамі.

Студэнцкі народ з задавальненнем прымаў удзел ва ўсіх конкурсах і віктарынах, пераможцы якіх узнагароджваліся салодкімі і памятнымі прызамі.

**К.ЯНКОВА, студэнтка гр.Б-22 філалагічнага факультэта.**

ІНФАРМУЕ СНТІ

## РЫХТУЕЦЦА КАНФЕРЭНЦЫЯ

З 26 па 30 кастрычніка 1998 г. у г.Мінску на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта будзе праходзіць VI Міжнародная канферэнцыя "Інфарматыка-98. Актуальныя праблемы інфарматыкі: матэматычнае, праграмнае і інфармацыйнае забеспячэнне". Яна праводзіцца Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і ставіць сваёй мэтай абмеркаванне тэарэтычных даследаванняў у галіне інфарматыкі, абагульненне вопыту распрацоўкі і прымянення сродкаў інфарматыкі на аснове новых інфармацыйных тэхналогій.

За даведкамі звяртацца ў СНТІ НДС (корпус N5, п.5-1, тэл. 56-73-38).

